# Біблія для дзяцей

прадстаўляе

# Нараджэнне Ісуса




Аўтар: Edward Hughes

Ілюстратар: M. Maillot

Пераклаў: Christian Lingua

Адаптаваў: E. Frischbutter; Sarah S.


Гісторыя 36 з 60


**www.M1914.org**

***Bible for Children,*** *PO Box 3, Winnipeg, MB R3C 2G1 Canada*



Ліцэнзія: Вы маеце права капіяваць ці друкаваць гэтую гісторыю, але не ў камерцыйных мэтах (не прадаваць яе).


Беларуская

Belarusian







Затым анёл сказаў Марыі, што яе сваячка Елізавета хутка народзіць дзіця, нягледзячы на старасць. Гэта таксама быў цуд. Неўзабаве Марыя наведала Елізавету. Яны разам праславілі Бога.
3


Марыя была заручаная з мужчынам па імені Іосіф. Іосіфу стала сумна, калі ён даведаўся, што Марыя чакае дзіця. Ён падумаў, што нейкі іншы мужчына быў бацькам.
4


Анёл Божы ў сне сказаў Іосіфу, што гэтае дзіця было Сынам Божым. Іосіф павінен быў дапамагчы Марыі даглядаць за Ісусам.
5


Іосіф паверыў Богу і паслухаўся Яго. Ён таксама падпарадкоўваўся законам сваёй краіны. У той час быў выдадзены новы закон, згодна якому Іосіф і Марыя павінны былі пайсці ў свой родны горад, Віфлеем, каб заплаціць падаткі.
6


Марыя ўжо была гатовая нарадзіць дзіця. Але Іосіф нідзе не мог знайсці вольны пакой. Усе гатэлі былі перапоўненыя.
7


Нарэшце, Іосіф знайшоў хлеў. Там, немаўлятка Ісус і нарадзіўся. Ягоная маці паклала яго ў яслі, месца, дзе звычайна ставілі ежу для жывёлін.
8


Непадалёк пастухі ахоўвалі свае статкі авечак.
Анёл Божы з’явіўся і сказаў ім радасную навіну.
“бо сёння нарадзіўся вам у горадзе Давідавым Збаўца, Які ёсць Хрыстос Гасподзь.
Вы знойдзеце Дзіця, Яно ляжыць у яслях”.
9
Раптам з’явілася мноства больш светлых анёлаў, якія ўслаўлялі Бога, кажучы:
“слава ў вышынях Богу, і на зямлі мір,
у людзях добрая воля”.
10
Пастухі паспяшаліся да стайні. Убачыўшы Дзіцятка, яны пачалі распавядаць усім сустрэчным тое, што анёлы казалі пра Ісуса.
11
Праз сорак дзён Іосіф і Марыя прынеслі Ісуса ў храм у Ерусаліме. Там чалавек па імені Сымон праславіў Бога за Дзіцятка, а старая Ганна, іншая слуга Госпада, таксама падзякавала Богу за Ісуса.
12
Абодва ведалі, што Ісус быў Сын Божы, абяцаны Збаўца. Іосіф ахвяраваў дзве птушкі. Гэта ахвяра, якую, згодна з Божым законам, бедныя людзі павінны былі прынесці, калі яны прадстаўлялі новананароджанае дзіця перад Госпадам.
13
Праз некаторы час асаблівая зорка прывяла мудрацоў з усходняй
краіны ў Ерусалім.
“Дзе Той, Хто нарадзіўся, Цар Юдэйскі?” – спыталі яны. “Мы хочам пакланіцца Яму”.
14
















Нараджэнне Ісуса

Гісторыя з Божага Слова, Бібліі

знаходзіцца ў

Мацьвея 1-2, Лукі 1-2

"Сведчанне словаў Тваіх прасвятляе."
Псалтыр 119:130

Бог ведае, што мы рабілі дрэнныя справы, якія Ён называе грахом. Пакаранне за грэх – гэта смерць.

Бог любіць нас так моцна, што Ён паслаў Свайго Сына, Ісуса, каб памерці на крыжы і аплаціць нашае пакаранне замест нас. Ісус уваскрэс з мёртвых і вярнуўся на нябёсы! Цяпер Бог можа прабачыць нашыя грахі.

Калі вы хочаце адвярнуцца ад вашых грахоў, тады скажыце Богу: Гасподзь, я веру, што Ісус памёр за мяне і цяпер зноў жывы. Калі ласка, увайдзі ў маё жыццё і прабач мае грахі, каб я мог мець новае жыццё цяпер, а потым быць з Табой назаўжды. Дапамажы мне жыць для Цябе, як Тваё дзіцё. Амін. Ян 3:16

Чытайце Біблію і размаўляйце з Богам кожны дзень!